Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 2 (95), 2016

## Право

*УДК 94:343:347.781.53*У.Д.Спасовіч"1863"*

# У.Д. Спасовіч і яго «Учебник уголовного права» (1863 г.)

А.П. Грахоцкі

Разглядаецца ўклад вядомага вучонага-крыміналіста прафесара У.Д. Спасовіча ў станаўленне навукі крымінальнага права ў Расійскай імперыі. Тэарэтычныя распрацоўкі У.Д. Спасовіча, выкладзеныя ў першым у Расіі «Учебнике уголовного права», палягаюць у аснове дактрыны сучаснага расійскага і беларускага крымінальнага права. У сваёй працы вучоны абгрунтаваў такія прынцыпы крымінальнага права, як законнасць, роўнасць, справядлівасць, сувымернасць злачынства і пакарання, гуманізм.
**Ключавыя словы:** падручнік, крымінальнае права, У.Д. Спасовіч, Расійская імперыя, злачынства, пакаранне, састаў злачынства, мера пакарання.

The contribution of a well-known forensic scientist Professor V.D. Spasovich into formation a science of criminal law in the Russian Empire is discussed. Theoretical developments of V.D. Spasovich set out in the first «Textbook of Criminal Law» in Russia, are the basis of the doctrine of modern Russian and Belarusian criminal law. In his work, the scientist proved such principles of criminal law as a rule of law, equality, justice, proportionality of crime and punishment, humanism.
**Keywords:** textbook, criminal law, V.D. Spasovich, Russian Empire, crime, punishment of the crime, Corpus delicti, punishment.

Імя У.Д. Спасовіча, поруч з імёнамі А.Ф. Кісцякоўскага, М.Д. Сергіеўскага, М.С. Таганцава, належыць да плеяды славутых вучоных-правазнаўцаў, якія ўнеслі велізарны ўклад у станаўленне класічнай школы крымінальнага права ў Расійскай імперыі. Навуковая творчасць У.Д. Спасовіча традыцыйна выклікае ўвагу даследчыкаў. Аднак комплексны аналіз яго «Учебника уголовного права» застаецца маладаследаванай тэмай у параўнанні з больш познімі сюжэтамі з жыцця вучонага, звязанымі з яго бліскучай адвакацкай дзейнасцю [1], [2], [3], [4], [5], [6], [7], [8]. Таму мэтай дадзенай работы з'яўляецца усёабдымны аналіз «Учебника уголовного права» У.Д. Спасовіча і вызначэнне ролі гэтага падручніка ў станаўленні навукі крымінальнага права ў Расійскай імперыі.

У 1857 г. пасля абароны доктарскай дысертацыі У.Д. Спасовіч распачынае навукова-педагагічную дзейнасць на кафедры крымінальнага права Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта: спачатку ў якасці ад'юнкта, затым – прафесара і загадчыка кафедры. Аднак у 1861 г. вучоны быў вымушаны звольніцца з універсітэта ў знак пратэсту супраць рэпрэсій у дачыненні да студэнцкай моладзі [6, с. 69–70]. З 1862 па 1864 г. У.Д. Спасовіч працаваў на пасадзе прафесара ў Вучылішчы правазнаўства і Аўдытарскім вучылішчы ў Санкт-Пецярбургу. Менавіта ў гэты час у 1863 г. выходзіць яго «Учебник уголовного права». Змест падручніка выклікаў абурэнне ў рэакцыйных колах тагачаснай навукі. У выніку падручнік трапіў на экспертызу ў III аддзяленне. Экспертная камісія пастанавіла, што ў кнізе змяшчаецца 36 месцаў, дзе сустракаюцца «варожыя думкі», якія «падрываюць асновы грамадскага ладу». Рашэннем камісіі падручнік быў выключаны з вучэбнага працэсу, а яго аўтар пазбаўлены права займацца выкладчыцкай дзейнасцю [3, с. 227–229].

«Учебник уголовного права» У.Д. Спасовіча стаўся першым падручнікам крымінальнага права ў Расійскай імперыі. Неабходна адзначыць, што першыя працы расійскіх навукоўцаў, прысвечаныя пытанням крымінальнага права пачалі з'яўляцца з другой паловы XVIII ст. Сярод найбольш адметных даследаванняў варта ўзгадаць работы С.Я. Дзясніцкага «Слово о причинах смертных казней по делам криминальным» (М., 1770), В. Гарагляда «Опыт начертания российского уголовного права» (СПб., 1815), П. Гуляева

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Российское уголовное право, составленное из российских государственных узаконений» (М., 1826), С.І. Баршэва «Общие начала теории и законодательства о преступлениях и наказаниях» (М., 1841). Аднак гэтыя працы, напісаныя яшчэ да прыняцця «Уложения о наказаниях уголовных и исправительных» (1845 г.), як правіла, мелі канспектыўны характар, уяўлялі сабой агляд дзейных нормаў крымінальнага заканадаўства і фактычна былі пазбаўлены дагматычнай распрацоўкі расійскага крымінальнага права [9, с. 30].

Як адзначыў У.Д. Спасовіч у прадмове да свайго падручніка, у планах аўтара была падрыхтоўка мнагатомнага выдання. Пасля выхаду ў 1863 г. падручніка па агульнай частцы крымінальнага права, вучоны разлічваў падрыхтаваць асаблівую частку, а таксама прысвяціць асобныя тамы судаводству і гісторыі крымінальнага права [10, с. 2]. Аднак лёс, які напаткаў першы том выдання, не дазволіў ажыццявіцца планам аўтара.

Падручнік У.Д. Спасовіча адрозніваецца ад папярэдніх абагульняючых работ па крымінальным праве лагічнай структурай даследавання. Першы раздзел прысвечаны тэорыі крымінальнага права, другі – крымінальнаму закону, трэці – злачынству, чацвёрты – пакаранню, у пятым разглядаецца мера пакарання, у шостым – прычыны, якія пагашаюць юрыдычныя наступствы злачынства, у сёмым раздзеле падаецца аналіз агульнай часткі «Уложения о наказаниях…». Па сутнасці, гэта структура (за выключэннем першага і апошняга раздзела) была перанята адным з найбольш вядомых вучняў У.Д. Спасовіча М.С. Таганцавым у яго падручніках па крымінальным праве (гл., напрыклад: [9]). Асновы такой структуры захоўваюцца і ў сучаснай вучэбнай літаратуры (гл. напрыклад: [11]).

На першых старонках кнігі У.Д. Спасовіч звяртаецца да філасофіі крымінальнага права, задаецца пытаннем: «На чым грунтуецца права дзяржавы караць?» [10, с. 10]. На думку даследчыка, інтэрпрэтацыя нормаў заканадаўства не дае магчымасці адказаць на пастаўленае пытанне. Адказ на яго можа даць толькі філасофія крымінальнага права. У.Д. Спасовіч прыходзіць да высновы, якая не губляе сваёй актуальнасці па сённяшні дзень: «Знание на пересчёт статей закона ещё не составляет науки и недостаточно ни для учёного криминалиста, ни для законодателя, ни для судьи» [10, с. 11]. Аўтар рэзюмуе, што ў аснове дзейнасці юрыста павінна палягаць крытычнасць мыслення, заснаваная на розуме, гэта значыць на філасофіі: «Криминалист должен всячески стараться следить за ходом философии, идти с нею в уровень, сообразовываться с ея успехами и последними добытыми ею результатами» [10, с. 11]. На думку вучонага, усе крымінальныя тэорыі з’яўляюцца толькі часткай таго ці іншага філасофскага светапогляду (ідэалізму ці рэалізму) [10, с. 11–49].

У рабоце аўтар звяртаўся да такіх філасофскіх катэгорый як справядлівасць і годнасць асобы. З’яўляючыся прыхільнікам ідэй лібералізму, У.Д. Спасовіч адзначаў, што першасным ідэалам чалавечага супольнага жыцця («общежития») з’яўляецца годнасць асобы, якая вымагае павагі, незалежнасці і свабоды. Забеспячэнне павагі да асобы і свабоды апошняй дасягаецца шляхам ідэалу справядлівасці. Згодна з гэтым ідэалам чалавек усведамляе неабходнасць прызнаць, не губляючы самапавагі, годнасць іншых асоб (істот, роўных сабе) і «… наслаждаться чужим достоинством как своим собственным» [10, с. 55]. На старонках падручніка У.Д. Спасовіч паўстае прыхільнікам раўнапраўя людзей у грамадстве. Вучоны прызнае годнасць асобы і роўнасць правоў за прадстаўнікамі ўсяго чалавечага роду. У адпаведнасці з гэтым, ён дае наступнае азначэнне справядлівасці – гэта «расширение идеалов своего достоинства в достоинство ближних, есть уважения себя и других как самого себя, уравнение всех ближних с собой» [10, с. 55 – 56].

У.Д. Спасовіч сфармуляваў аўтарскае азначэнне паняцця «злачынства». Паводле аўтара, злачынства – гэта «противозаконное посягательство на чье-либо право, столь существенное, что государство, считая это право одним из необходимых условий общежития, при недостаточности других средства охранительных, ограждает ненарушимость его наказанием» [10, с. 84]. Так, вучоны даваў фармальнае азначэнне злачынству. Яго матэрыяльная прыкмета (грамадская небяспека) яшчэ не знайшла свайго адлюстравання ў тагачаснай навуцы. Не прыжылася ў крымінальным праве і трактоўка злачынства як замаху на суб’ектыўнае права. З крытыкай гэтай дэфініцыі выступіў М.С. Таганцаў. На старонках

РЕПОЗИТОРИЙ ГРОДНОГО УНИВЕРСИТЕТА

свайго падручніка апошні пісаў, што права з'яўляецца абстрактным паняццем, яно не можа быць непасрэдным аб'ектам злачыннага замаху да тых пор, пакуль яно не будзе ўвасоблена ў існуючых дабротах ці ў канкрэтным інтарэсе [9, с. 42].

Заслугай У.Д. Спасовіча з'яўляецца ўвядзенне ў расійскую навуку крымінальнага права паняцця саставу злачынства, вядомага ў заходнееўрапейскай навуцы з канца XVIII – пачатку XIX ст. Вучоны даў падрабязную характарыстыку элементам саставу злачынства: аб'екту, суб'екту, аб'ектыўнаму боку, суб'ектыўнаму боку.

Пад паняццем «аб'ект злачынства» У.Д. Спасовіч разумеў права канкрэтнай асобы (фізічнай ці юрыдычнай) [10, с. 94–96]. У адпаведнасці з гэтым, вучоны лічыў некаральнымі ўчынкі асобаў, накіраваныя на пазбаўленне ўласных правоў. Напрыклад, чалавек не павінен падлягаць крымінальнай адказнасці за членашкодніцтва ці спробу самагубства, таму што адна і тая ж асоба не можа быць адначасова і аб'ектам і суб'ектам злачынства. Некаральным У.Д. Спасовіч лічыў і дапамогу ў самазабойстве: «… не может быть преступного пособничества к непреступному деянию». Фактычна, вучоны выступаў за эўтаназію. На яго думку, урач, які даў яд смяртэльна хвораму, каб пазбавіць яго пакут, павінен быць пазбаўлены пакарання згодна з прыгаворам суда ці памілаваны [10, сс. 97–98, 101].

У кантэксце характарыстыкі аб'екта злачынства У.Д. Спасовіч разглядаў і такія абставіны, што выключаюць злачыннасць учынку, як крайняя неабходнасць і неабходная абарона. Некаральнасць учынкаў здзейсненых у абставінах крайняй неабходнасці ці неабходнай абароны вучоны тлумачыў тым, што ў гэтых умовах адбываецца сутыкненне паміж правамі, падчас якога адно права можа быць захавана толькі за кошт парушэння другога [10, с. 103–111]. Напрыклад, У.Д. Спасовіч лічыў крайняй неабходнасцю крадзеж прадуктаў харчавання, здзейснены чалавекам, якому пагражала смерць ад голаду. Дадзены ўчынак аўтар інтэрпрэтаваў як сутыкненне асобы і ўласнасці. Асоба, яе свабода і здароўе з'яўляюцца больш каштоўнымі, чым уласнасць, таму для вызначэння незлачыннасці апісанага ўчынку, на думку аўтара, суд павінен быў высветліць, ці не скраў галодны больш за тое, што было неабходным для здавальнення голаду [10, с. 104].

Пры характарыстыцы суб'екта злачынства У.Д. Спасовіч абапіраўся на вучэнне аб наяўнасці свядомасці («вменяемости»), якое не губляе сваёй актуальнасці і ў сучаснай навуцы. Да прыкмет, якія вызнаюць стан бессвядомасці асобы вучоны адносіў: 1) недастатковае развіццё волі (навуковец увязваў гэта з малалетнім узростам), 2) «переходные затмения сознания» (лунацізм, ап'яненне, ліхаманка, цяжарнасць, пераходны ўзрост, стан афекту і г. д.), 3) псіхічныя захворванні [10, с. 118–129]. Напрыклад, У.Д. Спасовіч выступаў з крытыкай артыкула 118 «Уложения о наказаниях…», які разглядаў стан ап'янення злачынцы як акалічнасць, якая абцяжарвае адказнасць, пры ўмове, калі будзе даказана, што асоба наўмысна прыняла алкаголь для здзяйснення злачынства. Вучоны пісаў: «Допустим, что его (злачынцу. – *А.Г.*) следовало бы наказать, как будто бы он был трезв в минуту совершения преступления … но виновного все-таки не следовало бы наказывать строже того, кто совершил преступление в трезвом состоянии. Если он опохмелился, дабы с большею смелостью совершить преступление, значит, он не был твёрд в своей решимости преступной и хотел, напиваясь, подкрепить в себе искусственным образом эту решимость» [10, с. 405]. Як вядома, і расійскае, і айчыннае сучаснае заканадаўства не адмовіліся ад вызначэння ап'янення як акалічнасці, якая абцяжарвае адказнасць.

Характарызуючы аб'ектыўны бок злачынства, У.Д. Спасовіч даў крымінальную характарыстыку дзеяння і бяздзейнасці, здзейсненага злачынства і замаху на злачынства. Так, аналізуючы замах на злачынства, вучоны падкрэсліваў, што прынцыповае значэнне для яго каральнасці мае вызначэнне прычын, якія не дазволілі здзейсніцца злачыннаму намеру. Аўтар прапаноўваў наступную класіфікацыю адпаведных прычын: 1) злачынства не было скончана па незалежных ад злачынцы абставінах, 2) у сувязі з выкарыстаннем злачынцам непрыдатных сродкаў здзяйснення злачынства, 3) злачынства не было скончана па волі самога злачынцы [10, с. 135–139].

У першым выпадку даследчык лічыў правамерным прызначэнне за замах на злачынства паніжанага пакарання. У.Д. Спасовіч задаваўся пытаннем: ці хапіла б у злачынцы мужнасці

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

скончыць задуманае ў выпадку, калі б не надышлі абставіны, якія паслужылі перашкодай для здзяйснення злачыннага намеру? На думку крыміналіста, такое сумненне павінна быць вытлумачана на карысць злачынцы [10, с. 135].

У выпадку ж, калі злачынства не было здзейснена па прычыне выкарыстання непрыдатных сродкаў, вучоны падкрэсліваў, што асновай для каральнасці такога дзеяння з'яўляюцца не якасці сродкаў злачынства, а памылковыя погляду злачынцы адносна якасцей такіх сродкаў: «ошибка в выборе средств не извиняет преступника» [10, с. 136–137].

Звяртаючыся да трэцяй прычыны, аўтар падкрэсліваў, што замахі на злачынствы, якія былі прыпыненыя па волі самога злачынцы, не павінны падлягаць крымінальнаму пакаранню [10, с. 138–139]. Такі падыход захоўваецца і ў сучасным крымінальным праве. Паводле артыкула 15 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь добраахвотная адмова ад злачынства не цягне за сабой крымінальнай адказнасці.

На старонках падручніка аўтар разважаў і аб каральнасці падрыхтоўкі да злачынства. Даследчык быў упэўнены, што такія дзеянні не павінны падлягаць пакаранню, за выключэннем выпадкаў, якія яскрава сведчаць аб наяўнасці злоснага намеру: змова супраць дзяржавы, выпуск фальшывых манет, падробка дакументаў, стварэнне разбойніцкіх шаек і г. д. [10, с. 140–141]. У пэўнай ступені адпаведны падыход захоўваецца і ў сучасным праве. Напрыклад, згодна з артыкулам 13 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, не падлягае крымінальнай адказнасці падрыхтоўка да злачынстваў, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі.

Суб'ектыўны бок злачынства У.Д. Спасовіч разглядаў у кантэксце «вучэння аб інкрымінацыі» («учения о вменении»). Інкрымінацыя характарызавалася аўтарам як сувязь паміж справай і воляй – «зачисление лицу содеянного им в вину». У адпаведнасці з гэтым даследчык ажыццявіў глыбокі тэарэтычны аналіз відаў і ступеняў віны, даў вызначэнне паняццям «неасцярожнасць», «прамы» і «ўскосны намер» [10, с. 142–160].

Звяртаючыся да праблем пакарання, У.Д. Спасовіч падкрэсліваў, што ў крымінальным праве вылучаюцца дзве асноўныя мэты прымянення пакарання: 1) забеспячэнне бяспекі грамадства шляхам пазбаўлення злачынцы магчымасці і рашучасці шкодзіць грамадству; 2) пакаранне павінна садзейнічаць маральнаму або юрыдычнаму выпраўленню злачынцы, які ў выніку панесенага пакарання мусіў стаць здольным да жыцця ў грамадстве [10, с. 179]. На думку вучонага, мэта застрашэння не можа быць раўназначнай першым двум мэтам. Аўтар падкрэсліў: «Коль скоро допустимо, что даже и в павшем субъекте законодательство должно уважать человека, то из этого следует, что над этим человеком оно не в праве делать, как над животным, опыты назидательные для других» [10, с. 180].

У.Д. Спасовіч з'яўляўся паслядоўным прыхільнікам адмены смяротнага пакарання. Вучоны падкрэсліваў, што смяротная кара пазбаўлена важнейшых адзнак пакарання: 1) яна з'яўляецца неадменнай – «увековечивает всякую ошибку суда на счёт виновности подсудимого»; 2) смяротная кара не служыць выпраўленню вінаватага. Не пагаджаўся У.Д. Спасовіч і з «застрашлівай» функцыяй гэтага віду пакарання. Аналізуючы замежны вопыт, аўтар адзначыў, што адмена смяротнай кары не прыводзіць да ўсплёску злачыннасці [10, сс. 185–186, 189].

Яшчэ большае абурэнне аўтара выклікала прымяненне цялесных пакаранняў. Даследчык пісаў: «Казнь телесная есть … младшая сестра смертной казни, построенная на том же начале устрашения. Она ещё хуже смертной казни в двух отношениях: 1) она считается особенно унизительною, постыдною; 2) она не только не исправляет, но ожесточает и портит наказываемого человека» [10, с. 195]. Як вядома, цялесныя пакаранні ў Расійскай імперыі канчаткова былі адменены толькі ў 1904 г. Аднак і пасля гэтага яны працягвалі ўжывацца ў якасці дысцыплінарных пакаранняў у турмах.

На думку У.Д. Спасовіча, асноўным відам пакарання ў сучасным яму грамадстве павінна было стаць пазбаўленне волі ў выглядзе турэмнага зняволення або ссылкі. У гэтым кантэксце вучоны ажыццявіў падрабязны разгляд пенітэнцыярных сістэм ЗША і вядучых краін Еўропы [10, с. 211–266]. На думку крыміналіста, пазбаўленне волі павінна адпавядаць прынцыпу чалавечнасці: злачынец за час адбыцця турэмнага зняволення павінен стаць бясшкодным членам грамадства, у якое яму належыць вярнуцца пасля адбыцця пакарання [10, с. 268].

РЭПАЗІТОРЫЙ ПУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Разважаючы над праблемамі меры пакарання, вучоны надаў асаблівую ўвагу пытанням множнасці злачынстваў. У.Д. Спасовіч прыйшоў да шэрагу высноў, якія істотным чынам паўплывалі на далейшае развіццё навукі крымінальнага права. Аўтарам была выказана ідэя аб дыферэнцыяцыі крымінальнай адказнасці і індывідуалізацыі пакарання з пашырэннем магчымасцей судзейскага меркавання [10, с. 289–291]. У.Д. Спасовіч выказаўся за адмову вызначэння рэцыдыву як кваліфікацыйнай адзнакі [10, с. 295]. Акрамя таго, даследчык сфармуляваў паняцце і прыкметы працягваемага злачынства з мэтай яго адмежавання ад множнасці злачынстваў[10, с. 297–298] (падрабязна пра гэта гл.: [7]).

Асаблівая ўвага ў падручніку надавалася аналізу агульнай часткі «Уложения о наказаниях уголовных и исправительных» (1845 г.). У.Д. Спасовіч быў упэўнены, што ініцыяваная расійскім урадам на пачатку 60-х гг. XIX ст. судовая рэформа непазбежна выклікае замену «Уложения» 1845 г. новым крымінальным кодэксам, які ў поўнай меры будзе адпавядаць прынцыпам прагрэсіўных пераўтварэнняў Аляксандра II [10, с. 321]. Вучоны параўноўваў дзейнае «Уложение» з сярэднявечным зборнікам, які грунтаваўся на падставах казуістычнасці. Ён адзначаў, што кодэкс 1845 г. быў распрацаваны для канцылярскага, пісьмовага і сакрэтнага судаводства, што само па сабе выключае магчымасць яго выкарыстання пасля рэалізацыі судовай рэформы [10, с. 324–325]. Як паказаў час, прагнозы вучонага не спраўдзіліся, новае «Уголовное уложение» было прынята толькі ў 1903 г. Аднак у поўным аб’ёме яно так і не ўступіла ў законную сілу на момант распаду імперыі.

Такім чынам, ідэі прафесара У.Д. Спасовіча, выкладзеныя ў першым у Расіі «Учебнике уголовного права», заклалі падмурак фарміравання класічнай школы крымінальнага права ў Расійскай імперыі. Працы вучонага ўласцівы фундаментальная распрацоўка догмы крымінальнага права, абгрунтаванне прынцыпаў законнасці, роўнасці, справядлівасці, сувымернасці злачынства і пакарання, павагі да годнасці чалавечай асобы, каштоўнасці правоў і свабод чалавека. Тэарэтычныя распрацоўкі У.Д. Спасовіча аб складзе злачынства, інкрымінацыі, меры пакарання, множнасці злачынстваў палягаюць у аснове дактрыны сучаснага расійскага і айчыннага крымінальнага права.

## Літаратура

1. Фельдштейн, Г.С. Главные течения в истории науки уголовного права в России / Г.С. Фельдштейн. – Ярославль : Тип. губ. Правления, 1909. – 690 с.

2. Ляховецкий, Л.Д. Характеристика известных русских судебных ораторов с приложением избранной речи каждого из них / Л.Д. Ляховецкий. – СПб. : Центр. Типо-Литогр. М.Я. Минкова, 1897. – 325 с.

3. Смолярчук, В.И. Гиганты и чародеи слова: русские судебные ораторы второй половины XIX – начала XX века / В.И. Смолярчук. – М. : Юридич. лит-ра, 1984. – 272 с.

4. Троицкий, Н.А. Корифеи российской адвокатуры / Н.А. Троицкий. – М. : Центрполиграф, 2006. – 436 с.

5. Шалькевич, В.В. Этико-правовые воззрения В.Д. Спасовича в сфере уголовного судопроизводства : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.09 / В.В. Шалькевич ; Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь. – Минск, 2003. – 20 с.

6. Шалькевич, В.В. Владимир Данилович Спасович (к 180-летию со дня рождения) / В.В. Шалькевич // Законность и правопорядок. – 2009. – № 1. – С. 69–72.

7. Шкредова, Э.Г. Влияние взглядов В.Д. Спасовича на современное учение и законодательство о множественности преступлений / Э.Г. Шкредова // Вестник Южно-Уральского государственного университета. Серия Право. – 2006. – № 13. – С. 188–190.

8. Корнилович, Э. Король русской адвокатуры / Э. Корнилович // Юстыцыя Беларусі. – 2011. – № 4. – С. 66–69.

9. Таганцев, Н.С. Русское уголовное право: лекции. Часть Общая: в 2-х т. / Н.С. Таганцев. – СПб. : Гос. тип., 1902. – Т. 1. – 1115 с.

10. Спасович, В.Д. Учебник уголовного права / В.Д. Спасович. – СПб. : Тип. И. Огризко. – 428 с.

11. Бабий, Н.А. Уголовное право Республики Беларусь: общая часть / Н.А. Бабий. – Минск : Гос. ин-т управления и социальных технологий БГУ, 2010. – 662 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 15.01.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ